**Список литературы**

1. Глинский, А. А. Реализация компетентностного подхода в образовательном процессе / А. А. Глинский // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2014. – № 6. – С. 12–21.
2. Шадриков, В. Д. Базовые компетенции педагогической деятельности / В. Д. Шадриков // Сибирский учитель. – 2007. – № 6. – С. 5–15.
3. Хуторской, А. В. Компетентностный подход в обучении : нач.-метод. пособие / А. В. Хуторской. – М. : «Эйдос», 2013. – 73 с.

# АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ КАЗКІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

*Гатоўчыц Ю.В.,*
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*

Анатацыя. У артыкуле прыводзяцца прыёмы, якія можна выкарыстаць пры аналізе народных казак на ўроках літаратурнага чытання ў пачатковых класах. На прыкладзе казкі «Зайздросны дзядзька» паказваецца, як гэтыя прыёмы дапамогуць зразумець жанравую спецыфіку і ідэю казкі.

*Ключавыя словы: беларускія народныя казкі, формы работы з тэкстам.*

У сучасным адукацыйным асяроддзі асаблівае месца павінна заняць культурна-асобасная падрыхтоўка навучэнцаў, якая мае на мэце далучыць малодшых школьнікаў да нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей, да ўсведамлення культуры паводзін, сацыяльнага вопыту, які выпрацавала чалавецтва.

Эфектыўным сродкам для дасягнення гэтай мэты ў працы з дзецьмі малодшага школьнага ўзросту можа служыць казка. У ёй у іншасказальнай форме зашыфраваны жыццёвы вопыт папярэдніх пакаленняў, традыцый розных народаў, шматгранная і шматузроўневая культурная інфармацыя.

Вывучэнне казак у пачатковай школе дапамагае вырашыць цэлы шэраг задач, сярод якіх адзначым авалоданне сацыяльным і маральным вопытам, развіццё індывідуальнасці асобы, яе самастойнасці і крытычнасці мыслення [2, с. 3].

Менавіта ў казках выразна акрэслены ўяўленні пра свет і чалавека, дабро і зло, праўду і справядлівасць. І вельмі важна, каб малодшыя школьнікі ўспрынялі і пераанялі гэты духоўны вопыт народа.

Для вырашэння гэтай задачы неабходна знайсці той шлях аналізу, які дапаможа навучэнцу не проста асэнсаваць казку як твор мастацтва, але і зразумець занатаваныя ў ёй урокі мінулых пакаленняў.

Шляхі і прыёмы вывучэння народных казак залежаць ад яе тыпу. На ўроках літаратурнага чытання ў пачатковай школе вывучаюцца ўсе тыпы казак: чарадзейныя («Музыка-чарадзей» [4]), казкі пры жывёл («Лісіца і Гусак», «Хітры Вол», «Каза-манюка», «Муха-пяюха» [1]), сацыяльна-бытавыя («Недалікатны сын», «Зайздросны дзядзька» [3]).

Работу над казкай любога віду метадысты раяць пачынаць з расказвання, а не чытання твора настаўнікам. У час расказвання па памяці настаўнік выкарыстоўвае не толькі вербальныя, але і такія невербальныя сродкі выразнасці, як міміка, жэсты, позірк, пастава, што дапамагае стварць яскравыя, пераканальныя вобразы казачных герояў.

Традыцыйнамі відамі працы з казкай з'яўляюцца гутарка для праверкі першаснага ўспрымання; чытанне казкі вучнямі па частках і аналіз кожнай з іх; чытанне казкі «сам сабе» з заданнем; абагульняючая гутарка, якая падрыхтуе вучняў да расказвання казкі; чытанне казкі па ролях; складанне плана з дапамогай настаўніка, падрыхтоўка да расказвання казкі; расказванне казкі вучнямі.

Аднак такіх заданняў недастаткова для разумення спецыфікі казкі як літаратурнага жанру. Зразумець асаблівасці казкі як віда мастацтва, убачыць адметнасці яе кампазіцыі (традыцыйныя зачын і канцоўка), адметнасці стварэння вобраза казачнага героя дапамогуць наступныя віды заданняў:

– слоўнае і графічнае маляванне;

– параўнальны аналіз паралельных эпізодаў;

– складанне элементарных ацэначных характарыстык герояў і падрабязных іх пераказаў;

– аналіз кампазіцыі казкі;

– аналіз моўных сродкаў казкі;

– творчыя віды працы (прыдумаць працяг казкі, казка наадварот, скажэнне казкі, складанне казкі з некалькіх казак і інш.);

– паказаць на тэкставыя адрозненні ў традыцыйных для казкі паўторах;

– вылучэнне казачных прыкмет.

Для разумення маральных урокаў, закладзеных у казках, варта прапанаваць навучэнцам выканаць на наступныя заданні [6]:

– растлумачце, чаму адбылася тая ці іншая падзея,

– паказаць, з чаго смяецца ці што асуджае народ,

– паказаць адрозненне паміж словамі і ўчынкамі персанажаў; даць маральную ацэнку гэтым разыходжанням,

– растлумачыць, чаму ў казцы ўзнікаюць гаваркія імёны; ці заўсёды яны вызначаюць галоўнае ў персанажах;

– ахарактарызаваць танальнасць маўлення таго ці іншага персанажа, адпаведнасць яго інтанацыі яго думкам і ўчынкам,

– чаму можна навучыцца на прыкладзе казкі,

– расказаць, як і чаму змяніўся характар героя.

Напрыклад, у 3 класе вывучаецца беларуская народная казка «Зайздросны дзядзька» [3, с. 9]. Аўтар падручніка прапануе для вывучэння казкі наступныя пытанні: *Чаму бедны брат наказаў сваім сынам браць прыклад*

*з дзядзькі? З-за чаго дзядзька не сказаў праўды пляменнікам пра свае планы на заўтрашні дзень? Як яго гэта характарызуе? За што пан даў хлопцам цэлы воз збажыны? Чаму пляменнікі падманулі свайго дзядзьку? Што асуджаецца ў казцы?* [3, с. 11].

На нашу думку, гэтыя пытанні неабходна дапоўніць іншымі пытаннямі і заданнямі. Напрыклад, *чаму гэты твор з'яўляецца казкай? Якія казачныя прыметы можна знайсці ў тэксце? Да якога тыпу адносіцца гэтая казка? Назавіце адметныя рысы сацыяльна-бытавых казак. Ці ёсць паўторы ў гэтай казцы? Якія эпізоды паўтараюцца?*

Для таго, каб зразумець матывы казачных перасанажаў, мы раім разглядзець узаемаадносіны паміж героямі, карыстаючыся метадычным прыёмам В.А. Лазаравай, якая прапануе рабіць аналіз вобразаў герояў твора ў выглядзе структурнай схемы [5]:




Калі зроблены такі першасны аналіз, можна прапанаваць навучэнцам падумаць над наступнымі пытаннямі: *Як пляменнікі здагадаліся, што дзядзька іх падмануў? Як змяніліся іх адносіны да дзядзькі?*

Зразумець маральныя ўрокі гэтай казкі дапамогуць наступныя пытанні: *Як вы разумееце словы: дзядзька аж* ***чарнее*** *ад зайздрасці, зайздрасць* ***грызе****? Чаму зайздрасць – кепскае пачуццё? Растлумачце значэнне выдзеленых слоў у апошнім сказе казкі: Схапілі панскія слугі* ***прагнага*** *дзядзьку, пацягнулі на стайню ды так* ***узнагародзілі****, што ён ледзьве ачухаўся.*

Для разумення ідэі твора аўтар падручніка прапануе вучням выбраць прыказку, якая выказвае асноўную думку казкі: *Ад добрага не ўцякай і ліхога не рабі; Хітрэйшы за ўвесь свет не будзеш; Як ён да людзей, так і людзі да яго* [3, с. 11]. Можна папрасіць навучэнцаў растлумачыць назву твора.

У якасці творчага задання можна прапанаваць дзецям спрагназаваць, як далей будуць паводзіць сябе дзядзька і пляменнікі.

Такі падыход да аналізу казкі, на наш погляд, дапаможа навучэнцам малодшых класаў зразумець жанравыя асаблівасці сацыяльна-бытавых казак, выявіць маральныя ўрокі, занатаваныя ў іх.

**Спіс літаратуры**


1. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск. : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – Ч. 1. – 135 с.
2. Воропаева, В. С. Литературное чтение. 3-4 классы. Путешествие в мир сказки : пособие для учителей общеобразоват. учреждений с рус.яз. обучения/ В. С. Воропаева, Т. С. Куцанова. – 2-е изд. – Минск : Аверсэв, 2012. – 128 с.
3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск. : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 2. – 118 с.
4. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 4 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск. : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – Ч. 1. – 134 с.
5. Лазарева, В. А. Технология анализа художественного текста на уроках литературного чтения в начальной школе / В. А. Лазарева. – М. : Институт инноваций в образовании им. Л.В.Занкова: Издательский дом «ОНИКС 21 век», 2003. – 96 с.
6. Рабчук, М. Н. Инновационные подходы к работе со сказкой в начальной школе / М. Н. Рабчук // Современный урок языка и литературного чтения в начальной школе: эффективная организация образовательного процесса : сб. материалов регионального науч.-метод. семинара, Брест, 12 нояб. 2015 г. / Брест. гос. ун-т ; научный редактор Г. М. Концевая. – Брест, 2016. – С. 101–103.


---

## МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ЗАДАННІ ЯК ПРЫЁМ ФАРМІРАВАННЯ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ


*Грыбко А.А.,*

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*



Анатацыя. Ва ўмовах блізкароднага руска-беларускага білінгвізму асаблівая увага ў працэсе навучання беларускай мове надаецца развіццю моўнай асобы, яе здольнасцей і творчага патэнцыялу, якія неабходны для актыўнай дзейнасці, сацыяльнага самавызначэння і самарэалізацыі.



*Ключавыя словы: моўная асоба, кампетэнтасны падыход, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, сістэма практыкаванняў, інсцыніроўка, назоўнік.*


Моўная асоба – гэта чалавек, які валодае магчымасцю ствараць і ўспрымаць тэксты, якія адрозніваюцца:

1) ступенню структурна-моўнай складанасці;

2) глыбінёй і дакладнасцю адлюстравання рэчаіснасці;

3) пэўнай мэтавай накіраваннасцю [1].

*Кампетэнтнасны падыход* у навучанні мове прадугледжвае разам з атрыманнем ведаў пра мову развіццё ўменняў аналізаваць і сістэматызаваць